*УДК 392.5(476.2-37Гомель)*

**А. А. Ганчарэнка**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ У ВЁСЦЫ ГРАБАЎКА ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

*Артыкул прысвечаны апісанню абрадаў і звычаяў, звязаных з вяселлем маладых ў вёсцы Грабаўка. Аўтар аналізуе структуру рытуалаў, вылучае галоўныя ролі- жаніха і нявесты. Асаблівая ўвага надаецца сімволіцы магічных дзеянняў і прадметаў, накіраваных на доўгі і крэпкі шлюб. Матэрыялы ўзяты са слоў жыхароў вёскі, якія з'яўляюцца асновай артыкула, сістэматызаваны і дапоўнены аўтарам, а таксама ўзяты з іншых крыніц.*

Вяселле – комплекс абрадаў і звычаяў, якія суправаджаюць заключэнне шлюбу і з'яўляюцца своеасаблівым актам зацвярджэння новай сям'і. Як заўважыла К. Л. Хазанава, "вяселле з'яўляецца адметным мерапрыемствам у жыцці чалавека. Духоўна, матэрыяльна і фізічна пасля вяселля людзі спрадвеку мянялі свой стан і жыццё. Юнацтва змянялася сталасцю, гарэзлівасць – адказнасцю, летуценнасць – мудрасцю. Відавочна таму вяселле ў кожнага народа суправаджалася разнастайнымі рытуаламі, дзеяннямі і працэсамі, як ніводная іншая падзея каляндарнага ці абрадавага цыклу" [1, с. 184].

У беларускай культуры вяселле – гэта не проста свята, а важны момант ў жыцці, які змяняе статус чалавека. Гэта не проста юрыдычны факт стварэння сям'і, а духоўнае і магічнае яднанне двух родаў, якое традыцыйна замацоўваецца праз сімвалічныя рытуалы, спевы і супольнае частаванне. Народнае гулянне вяселля ў Грабаўкі, мае свае доўгія карані, якія мы можам прасачыць, калі гэта ўсё пабачым, пачуем ад каго-небудзь.

У вёсцы Грабаўка ёсць свае павер'і і звычаі, аб якіх нам крышачку паведаміла жыхарка вёскі Грабаўка, Чумянок Клаўдзія Аляксандраўна, 1961 г. н.: "*Вяселле гуляюць 3 дні. Спачатку гуляюць свадзьбу ў маладой, як вось калісь я выходзіла замуж, то гулялі ў мяне свадзьбу, усе сабіраюцца і жаніховыя, і ўсе. Жаніх ідзе да нявесты са сваёй тамадою, ідзе і нясе вёльца, калісь ёлку ёй украшалі. Яна ўкарашана лентамі, цвятамі і ідзе жаніх з гэтымі ёлкамі. Ужэ прыйшлі з ёлкай, співаюць песні, там свадзебныя. Потом ужэ садзяцца за стол і гуляюць свадзьбу*" (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Так адбываецца ў першы дзень вяселля. А ў другі дзень гуляюць у жаніха. Усе нявесціны сябры і родзічы ідуць гуляць да жаніха. Потом у жаніха нявесту завіваюці, дзелаюць з нявесты маладзіцу, і з двух бакоў абходзяць, сядзяць за сталамі, з адной стараны ходзіць маладзіца і з другой: "*Яны ўже с платком ідуці, і ідуць да нявесты, спяваюць над её песню, што была дзяўчынаю, а стала маладіцаю, замужняю і адзеюць ёй платок, фату знімаюць і вешаюць на вугал, а ёй адзеюць платок і гэта яны гуляюць ужо*" (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

На трэці дзень – збіраюцца ў адной хаце, яшчэ гэты дзень называлі "*петухі*". Ходзяць па дварах , бяруць мяшок, пераапранаюцца ў малодага і маладую, у цыган. Мясцовыя жыхары і неаднаразовыя сведкі і ўдзельнікі вясельных мерапрыемстваў успамінаюць: "*І хто ў свадзьбе гуляў к таму да дому ходзяць і яны ужэ сабіраюць курэй, з-за гэтага і называюць "петухі". К кожнаму ў дом прыходзіш, там усё спяваеш пра ўсё гэтае во і ў каждага петуха крычаць, вунь ідзіце лавайце ,і бяжыш і лаваеш гэтага пятуха. Насабіраеш ужэ гэтых петухоў ,потым іх скубеш, мыеш і тушым, варым, жарым. І цэлы вечар прыбіраюцца ў маладую, робяць з мужыка маладую, а з жанчыны маладога і гуляюць цэлы вечар"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Адметным з'яўляецца абрад пасвячэння ў зяця: *"Усе падарылі падаркі, разабралі каравай, каравай дзеліць так, наш каравэй у нас дзелім, а жаніха каравай у яго доме дзеліцца. Жаніх павінен цёшцы купіць абутак, надзяе абутак, кажуць на іх чобаты, замест чобатаў куплялі туфлі. Цёшча танцуе і пяе :*

*Ах, чобаты, чобаты, чобаты*
*Ой,да за гэтыя туфлі*
*Дзякую я жаніху*
*Нізкі я паклон ім б'ю.*

*Ногі мые жаніх цёшцы, тады потым надзяе башмакі. Мылі водкаю ногі, ставілі тазіка, туды ногі цёшчыны, жаніх водкай памыў, надзеў туфлі гэтыя і ўжэ гуляюць так"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Каравай звычайна дзеляць два сваты, з боку жаніха прадстаўнік і з боку нявесты, і так яны дапамагаюць адзін аднаму, каб падзяліць каравай. А каля каравая госці раскладваюць падарункі. Пры гэтым варта ўспомніць, што "*жаніх павінен купіць кальцо і свадзебнае плацце. Да свадзьбы не жылі ўмесце"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Пра свае звычаі і абрады ў сям'е, нам паведаміла другая жыхарка вёскі Грабаўка Свірыдзенка Валянціна Яфімаўна, 1957 г. н.: "*На маёй свадзьбе першы дзень гулялі. На другі дзень маладая не ўплаці, гэта ж яна першы дзень,а на ўтары дзень, у другом плацці. І як рабілі ў мяне, з дзевіцы дзелалі маладзіцу. Свекроў пакупала платок,*

*вот тады когда мяне прывезлі і мой брат ездзіў. Абходзіў у гэтым платке і сыпалі зярном, галаву аб галаву сутыкалі і потым знімалі фату і вешалі каля іконы, а павязывалі платок. І як казалі, дзевіца стала маладзіцай. І цэлы вечар ў гэты платке, но не ў фаце. Дажэ ў клуб хадзілі после гулянкі ў платке. Кагда ў сваты прыхадзілі, дак нявеста далжна была пакланіцца сватам і яны давалі грошы. Там давалі траячку, руб, пяцёрка. Але прыхадзілі з хлебам і соллю, ужэ сваты, а дружкі (падругі нявесты), тожэ прысутствавалі на сватах. І мы далжны былі ўкрасць гарбушку з хлеба, і пакусочку разламіць, і ўсе незамужніе далжны былі з'есці, каб замуж выйсці. А зіма была, калі я была на свадзьбе ў суседкі, дак палажылі ў пачтовы яшчык, а яна замерзла, дак аттаівалі, хацелі ж замуж выйсці. Перагаражывалі дарогу маладым, толькі пасля загсу, а не да яго. Едуць па вуліцы і сустракаем іх, на стульчыку палаценечка, а там хлебушэк і соль, і сустракаем. І яны далжны ўжэ гэты хлеб выкупіць, там ставілі на кажды вугал табурэткі па бутылцы"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Пра трэці дзень вяселля захаваліся наступныя звесткі: "*А на трэці дзень смалілі курыцу. Прашла свадзьба, і на трэці дзень сабраліся пагулялі. У гэтым дварэ дзе свадзьба ідзёт, куру рубілі, абшчыпалі, ў ведро, распалівалі на вуліцы касцёр. У вядро гэтую курыцу,маркоўку і варылі як суп, разлівалі ўсім у тарэлкі. Кагда мяне замуж выдавалі, то таксама было такое. Перадзеваліся ў гэты дзень у цыганей і маглі гэтую курыцу на палку, ісці па сялу, песні пець і маглі да возера пайсці, на поле пайсці.*

*Еслі жаніх і нявеста з адной дзерэўні, то первы дзень гуляюць у нявесты, рапісаліся ў сельскім савеце. Раней жа распісываліся ў сельскімсавеце тут па месце. Пешкі хадзілі, калі машын не было. На ўтары дзень,дажэ маглі ў 12 гадзін, у час ночы пайсці сваты. Яны бралі ўзелкі, пасцель, ну як прыданая нявесты , і сваты ідуць да жаніха. Казалі, што нявеста павінна ў мужа жыць.*

*Яшчэ быў жа выкуп нявесты. Нявесту ў горадзе, закрывалі ў комнаце. А мяне выкупалі ў падругі дома, у вёсцы. Хлопцы прыязджалі, сваты прыязджалі і яны ўсе таргаваліся то за фату, то за туфельку, за ножку, за ручку. Звычайна было шампанское, канфеты, манеткі. Вось і ўсё"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.)

Пра сваё вяселле і звычаі, якія праводзіліся раней, паведаміў жыхар вёскі Грабаўка, Чумянок Уладзімір Аляксеевіч, 1978 г. н.: " *Гулялі доўга, не знаю дажэ как гаварыць. Во ў дзень свадзьбы, да ЗАГСа жаніх ехаў першы, а нявесты ўтарая. Павінны ехаць па розным машынам,а ўжэ после свадзьбы, дык ўмесце. У ЗАГСе сустракалі нас с хлеб і соллю, і гаварылі: " Рады бачыць вас у нашым ЗАГСе. Жадаем вам здароўя, каб у жыцці ўсё было добра". Жаніх і нявеста ў розных комнатках. У самым пакоі, дзе распісваюцца, жаніх і нявеста далжны*

*былі стаць на рушнік, яго сцеліць дружок і падружка. А яшчэ гаварылі, перад тым как стаць : "на рушнік стаць, умесце век шагаць", Пасля таго, как расписаліся жаніх і нявеста, усегда ідзе яшчэ распісывацца дружок і падружка. На свадзьбе шмат песен гуляла, і былі ж ігры. Во ў мяне была адна, помню да сіх пор. Нявеста і хто-небудзь яшчэ далжны ў мужчыны перакаціць яблако, і хто шустрэе. Каціілі праз кашолу, туды засовывалі і к канцу другой каціілі"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Вяселле абавязкова суправаджалася вялікім застоллем. На ганаровых месцах за сталом размяшчаліся нявеста і жаніх. Цікавыя звесткі захоўваюцца пра падзел каравая: "*Заўсёды спрашывалі: "Разрашыце каравай благаслаўляць", і так тры раза. Дзялілі яго з двух старон. Давалі спачатку не жанатым і гаварылі: "я прыймаю гэты светлы хлеб"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Падарункі маладым часта суправаджаліся кемлівымі прыгаворкамі: "*Дарылі, што-небудзь і казалі: "Дарую табе пуд ваты, чтоб свекруха не выганяла з хаты. Трымай каробачку жаб, чтоб не любіў другіх баб. Дару маладому палена, каб пацалаваў маладой калена. Дарую пучок Цыбулю, чтобы круціла свякрухі дулі. А маладому лапату, каб ганяў цёшчу кругом хаты. Каб на каўрэ каталіся і ўлюбляліся. Дарую зелёную рошчу, каб пацалаваў цёшчу. Дару маладым зялёнага дуба (грошы), каб было заўсёды любо. Падару маладым утку, каб палаваліся сію мінутку. За этот кусочак, яшчэ разочак,а за гэту чарачку,ну яшчэ парачку".*

*Калі дарылі падарункі ды грошы, дак іх дзялілі, але грошы бралі толькі праз платочак. І нявеста павінна падарыць усей радне жаніха падарункі. Калі надзявалі платок, то пілі разоў пяць чарачак, але не поўных,а толькі крышачку і заўсёды далівалі. А потым апошнюю не пьюць,а ў паталок выліваюць. Здымалі фату маёй нявесце і надзевалі платок- хросна мая і яе цётка. А калі надзелі то гаварылі:*

*З харошага цеста- добрую паленніцу,*

*З харошай дзеўкі- добрую маладзіцу.*

*Вось так і гулялі"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А.).

Як мы можам пабачыць, то Грабаўка поўная цудаў, адметных звычаяў і абрадаў, якія жыхары ведалі, захоўвалі і выконвалі. З гэтых тэкстаў можна пабачыць прыкметы, пра якія мы і даведаліся ў жыхароў, сярод такіх прыкмет:

*"Нельга перагараджаць пуць да роспісі, а то будзе не доўгі шлюб. Не жылі раней разам да шлюбу, бо не будзе шчаслівы брак, і хутка распадзецца ён. Абавязкова трэба кланяцца сватам, так ты заслугоўваеш павагу. Калі з каравая, які на свадзьбе стаіць, з'есці корачку яго, то у скорым годзе выйдзеш замуж. Жаніх павінен унесці нявесту ў хату на руках- будзе дамавік лічыць яе не чужой,*

*а сваёй. Пры ўваходзе ў хату жаніха, нявеста павінна разбіць блюдца, і пара павінна пераступіць праз яе, тады не будзе скандалу ў доме. Нявеста павінна выбіраць закрытыя туфлі (насы закрытыя), тады шчасце з дому не ўцячэ"* (запісана студэнтам Ганчарэнка А. А., ад жыхароў вёскі Грабаўка па матыву іх расказаў)

Вяселле – гэта не проста прыгожае свята, а глыбокі сімвал саюза двух душ, у якім сучасныя трэнды цесна пераплятаюцца з векавой мудрасцю продкаў. Кожны абрад, ад кранальнага абмену пярсцёнкамі да вясёлых народных традыцый, нясе ў сабе асаблівы код кахання, вернасці і пераемнасці пакаленняў.

Вывучаючы шматстайнасць вясельных рытуалаў, мы бачым, што, нягледзячы на змену эпох і моды, сутнасць урачыстасці застаецца нязменнай: гэта трыўмф жыцця і стварэнне новай сямейнай гісторыі. Няхай выбар канкрэтных традыцый для вашага дня будзе свядомым і шчырым, бо менавіта з такіх унікальных дэталяў складваецца непаўторная атмасфера свята, якое застанецца ў памяці як пачатак доўгага і шчаслівага шляху. У рэшце рэшт любое вяселле – гэта вялікае таямніца кахання, дзе абрады служаць толькі прыгожым абрамленнем для галоўнага – пачуццяў маладога і маладой, а таксама гатоўнасці берагчы адзін аднаго.

Менавіта на прыкладзе вёскі Грабаўка мы можам на свае вочы пабачыць, як гэтыя старажытныя матывы ажываюць і захоўваюць сваю першародную сілу. Мясцовыя вясельныя звычаі з'яўляюцца сапраўд-най жывой энцыклапедыяй, дзе кожны рух і кожнае слова напоўнены глыбокім сэнсам, які передаваўся ад маці да дачкі. Грабаўка паказвае нам, што традыцыя – гэта не застылы помнік мінулага, а пульсуючая энергія, якая і сёння здольна зрабіць сучаснае свята больш душэўным, сапраўдным і поўным сакральнай моцы нашых продкаў.

**Спіс літаратуры**

1 Хазанава, К. Л. Трэці дзень вяселля ў лексіцы гаворак Гомельшчыны / К. Л. Хазанава // Известия Гомельского государственного университе-та имени Ф. Скорины. – 2012. – №1(70). – С. 184–188.